**Настаўніцкая газета, 16 жніўня 2014 г.С.22.**

# ЁН БЫЎ ПЕСНЯРОМ ПЕРАМОГІ

(18 жніўня 2014 г. - 90-годдзе паэта-песенніка М.Ясеня)

Імя гэтага чалавека добра знаёма ў нашай краіне. У свой час яго вершы, стаўшыя песнямі, спяваў " увесь Савецкі Саюз".

Адзін з самых папулярных беларускіх кампазітараў, народны артыст Беларусі, лаурэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Леанід Захлеўны пісаў:

"Я благодарен судьбе, которая дала мне возможность встретиться с поэтом Михаилом Ясенем. Да нашего знакомства Михаил Ясень был уже известным поэтом-песенником. К тому времени такие песни, как "Обелиски" на музыку Д.Смольского. "Память сердца", а позднее "Письмо из сорок пятого", "Майский вальс" на музыку И.Лученка, стали любимыми и популярными в Советском Союзе.

…На мой взгляд, благодаря нашему творческому содружеству, таланту и песенному чутью М.Ясеня появились таеие песни, ка "Победа", "Милосердие", "История одной любви", "Буйничское поле". "Татьяна Фёдоровна" и др.

…У песен Михаила Ясеня счастливая судьба: они записаны на пластинки, компакт-диски, включены в школьные программы, звучат на многих концертных площадках как в нашей стране, так и за её пределами в исполнении популярных певцов и известных коллективов".

Сапраўднае прозвішча Міхаіла Ясеня - Гольдман Міхаіл Аронавіч. Ён нарадзіўся 18 жніўня 1924 года ў Мінску у сям'і рабочага.

Міхаіл вучыўся спачатку ў беларускай, а потым у рускай. Пасля заканчэння 8-га класа ён паступіў у будаўнічы тэхнікум.

Дапытлівы хлопчык быў сведкам многіх цікавых падзей у сталіцы Беларусі і нават іх удзельнікам. Напрыклад, у складзе дзіцячай дэлегацыі дзевяцігадовы школьнік Міхась Гольдман вітаў першы з'езд пісьменнікаў Беларусі, які праходзіў у Мінску ў 1934 годзе.

У размове з аўтарам гэтых радкоў Міхаіл Ясень успамінаў:

"На маіх вачах пайшоў першы трамвай у Мінску. Мне пашчасціла ўбачыць зблізку кіраўнікой нашай рэспублікі Мікалая Гікалу, Аляксандра Чарвякова, Мікалая Галадзеда, амаль усіх ваеначальнікаў, якія служылі ці наведвалі сталіцу БССР. Не забуду, што адзін раз я нават сядзеў на каленях Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР Аляксандра Рыгоравіча Чарвякова, які быў вельмі добрым і ласкавым да дзяцей. Дарэчы мая жонка Эла Навумаўна, з якой я пазнаёміўся праз шмат гадоў пасля вайны, сядзела за адной партай і сябравала са старэйшай дачкой будучага Маршала Савецкага Саюза Георгія Жукава.

Адной чы мяне падвозіў на сваёй машыне прафесар медыцыны Клумаў, будучы актыўны ўдзельнік Мінскага антыфашысцкага падполля і Герой Савецкага Саюза. Зблізку я бачыў маладую,, але вельмі папулярную спявачку Ларысу Пампееўну Александроўскую.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Я рана навучыўся чытаць і захапляўся кнігамі. З вялікай удзячнасцю я ўспамінаю многіх сваіх настаўнікаў - Веру Пятроўну Паўлоўскую (выкладчыцу гісторыі), Івана Ануфрыевіча Гальчука, Ганну Вікенцьеўну Рэгель, Ніну Лукінічну Правільшчыкаву. Яны вучылі мяне дабру. На мой погляд, прафесіі настуўніка і медыка – самыя высокародныя на свеце.

Лета я звычайна праводзіў з маці ў вёсцы, а некаторы час жыў з ёй у мястэчку Глуску, дзе яна працавала ў аптэцы.

Прырода нашай рэспублікі - лясы, лугі з водарам траў і кветак, паляны, узгоркі, палі – мяне заўсёды вабіла с ваёй прыгажосцю, можна сказаць, прыводзіла ў захапленне. Любоў да беларускай прыроды засталася ў мяне назаўсёды. Магчыма, хараство беларускай прыроды паўплывала на маё захапленне мовай і творчасцю беларускіх пісьменнікакў. Асабліва я любіў чытаць творы Якуба Коласа, Змітрака Бядулі (дарэчы.з яго сынам я сябраваў), Янкі Маўра. Я зачытваўся “Новай зямлёй”, “Дрыгвой”, “Салаўём”, “Палескімі рабінзонамі” і іншымі творамі беларускіх пісьменнікаў. Пасля вайны я неаднаразова сустракаў на вуліцы Якуба Коласа.

Наша сям’я жыла бедна. Асноўнай ежай была бульба з таранкай ці камсой. Зрэдку выпадалі мясныя дні. Памятаю, аднойчы бацька прынёс галоўку цукру. Вось гэта і было святам.

Да верасня 1939 года польская мяжа была побач ад Мінска. Адчуваўся подых вайны. У школе мы, дзеці таксама рыхтаваліся да вайны. Сядзелі ў процівагазах на занятках, трэніраваліся тушыць запаляльныя бомбы, вывучалі ваенную справу ў розных гуртках...

Потым я з цікавасцю вучыўся ў будаўнічым тэхнікуме, стаў атрымліваць стыпендыю і з гонарам аддаваў яе маці. Гэта быў мой першы заробак…”.

Першы дзень Вялікай Айчыннай вайны Міхась Ясень сустрэў на практычных занятках па геадэзіі ў раёне сучаснага парка Чэлюскінцаў, які да вайны называўся Выставай. Заняткі праводзіў строгі немнагаслоўны выкладчык Міхаіл Васільевіч Дарашэвіч, які пасля вайны стаў вядомым-вучоным-геадэзістам, прафесарам, рэктарам Беларускага палітэхнічнага інстытута, а потым міністрам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Калі студэнты вялі тэадалітную здымку мясцовасці на трасе, раптам з драўлянага дома, што стаяў ля дарогі насупраць лесу, па радыё загучаў трывожны голас…Ад імя Савецкага ўрада выступаў Вячаслаў Молатаў.

24 чэрвеня Міхась Ясень з маці паспеў у Барысаве сесці ў апошні цягнік, які паёз іх у Расі. Яны апынуліся ў Мічурынску, а бацька – у Сталінградзе. Хутка ўся сям’я аказалася ў Сталінградзе, дзе 17-гадовы Міхась пачаў працаваць рабочым – станочнікам на мецізным заводзе. Гэта прадпрыемства выпускала ўзрывальнікі для мін. Рабочы дзень цягнуўся 12 гадзін,. калі лічыць гадзіну на дарогу. Дадому Міхась прыходзіў смяротна стомленым, у запэцканай вопратцы звальваўся на ложак. А ранкам ізноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спяшаўся на працу. Вясной і летам 1942 года нямецкая авіяцыя пачала бамбіць Сталінград.

13 жніўня 1942 года Міхась Ясень, якому яшчэ не споўнілася 18 гадоў, разам з іншымі маладымі рабочымі ўступіў у Чырвоную Армію.

На рачным трамвайчыку яны пераправіліся цераз Волгу, пастроіліся калонай і стэпам пайшлі ў напрамку Астрахані.

На станцыі Дасанг навабранцаў апранулі ў вайсковую форму. Разам з усімі Ясень прыняў прысягу і эшалон праз сталінградскі стэп павёз будучых чырвонармейцаў на далёкі Алтай. Там з навабранцаў рыхтавалі маршавыя роты. У лістападзе 1942 года ім выдалі новую форму і бялізну, і Міхася Ясеня разам з другімі ў люты мароз пагрузілі ў эшалон.

Ён стаў радавым чырвонаармейцам і ваяваў на Волхаўскім і Ленінградскім франтах у складзе артылерыйскага палка 286-й Ленінградскай Чырвонасцяжнай дывізіі.

Доўгі час воінская часць, у якой служыў Міхаіл Аронавіч, удзельнічала ў абарончых баях на Волхаўскім фронце і толькі ў студзені 1944 года яна перайшла ў наступленне.

Вось як аб гэтым ён напісаў у вершы "Юность»:

«Двести восемьдесят шестая
Защищала здесь Ленинград…
До сих пор я не понимаю,
Как тут смог уцелеть солдат

Здесь воронки, одни воронки
От села и до села.
Похоронки да похоронки
Принимала от них земля.

Тут болота, одни болота,
И в траншеях старых вода.
В них пехота, одна пехота
Бой жестокий тогда вела…

Двести восемьдесят шестая,
Ты в боях побеждала смерть!
До сих пор я не понимаю.
Как я смог тогда уцелеть».

У гутарцы з аўтарам гэтых радкоў Міхась Ясень нагадаў:

"Не магу забыць цяжкую пераправу цераз раку Волхаў. Чырвонае зарыва пажараў Ноўгарада, узятых у палон нямецкіх салдат і афіцэраў, якія грэлі рукі ля вогнішча на фоне праваслаўных сабораў, нямецкія вайсковыя могілкі з бярозавымі крыжамі.

Шмат чаго памятаю я… Смерць не аднойчы глядзела мне ў вочы, і сёння я здзіўляюся, як мне ўдалося застацца жывым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Часам я сам сабе задаю пытанне:

“Што мяне выратоўвала ў тыя вогненныя гады, што дапамагала?”

I сам сабе адказваю:

“Хутчэй за ўсё, гэта мая загартоўка, заняткі спортам,дакладней, захапленне гімнастыкай, боксам, штангай у перадваенныя гады і вера ў тое. што я зноў пабачу маіх дарагіх бацькоў, сваю Беларусь, свой родны Мінск…

Пасля вызвалення Ленінграда з блакады наша 286-я Ленінградская Чырвонасцяжнай стралковая дывізія ўдзельнічала ў прарыве лініі Манергейма ў Карэліі…

У ліпені 1944 года, у тыя дні, калі вызвалялі мой родны горад Мінск, на полі бою за выкананне баявой задачы я атрымаў медаль “За адвагу”.

З мая 1945-га па красавік 1947 года я служыў у Германіі, у Групе савецкіх акупацыйных войск, дзе быў малодшым лейтэнантам, камандзірам узвода ўпраўлення мінамётнага палка”.

Пасля дэмабілізацыі ў красавіку 1947 года Міхась Ясень вярнуўся ў родны Мінск. Ён пачаў вучыцца і працаваць у праектна-канструктарскіх арганізацыях

Міхась Аронавіч закончыў на “выдатна” школу рабочай моладзі і паступіў у Беларускі палітэхнічны інстытут, дырэктарам якога быў М.В.Дарашэвіч – той самы выкладчык будаўнічага тэхнікума, з якім ён сустрэў 22 чэрвеня 1941 года паведамленне пра пачатак вайны.

У 1956 годзе ён скончыў БПІ імя І.В.Сталіна па спецыяльнасці “Тэхналогія машынабудавання. металарэзныя станкі і інструменты”, Доўгі час Ясень працаваў інжынерам-канструктарам. Аб яго плённай працы і працоўным энтузіязме гаворыць той факт, што Міхась Ясень меў 15 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы. У 1966 годзе ён стаў лаурэатам Усесаюзнага агляду тэхнічнай творчасці, а потым быў узнагароджан Срэбным медалём ВДНГ СССР.

Апошняе месца яго працы – Інстытут цвёрдага цела і паўправаднікоў Акадэміі навук Беларусі на пасадзе інжынера-канструктара другой катэгорыі.

Многія беларускія кампазітары называюць Міхася Ясеня аўтарам вялікіх песень. За паўстагоддзе творчай дзейнасці ён стварыў на рускай і беларускай мовах каля сотні вершаў аб вайне, многія з якіх сталі песнямі.

Сярод іх “Память сердца”, “Майский вальс”. “Письмо из 45-го” (музыка Ігара Лучанка), “Обелиски” (музыка Дзмітрыя Смольскага), якія сталі любімымі і вельмі папулярнымі не толькі ў Савецкім Саюзе, але і за яго межамі.

У адной з маіх гутарак з Міхасём Ясенем, з якім я сябраваў амаль сорак гадоў, ён адзначыў:

“Сваю першую песню я напісаў у пачатку 1950-х гадоў. Яна была на беларускай мове. Верш я прынёс у кансерваторыю Івану Іванавічу Кузняцову, які напісаў музыку на мае першыя вершы. Першы врш на беларускай мове я надрукаваў у газеце “Мінская праўда”, дзе загадчыкам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аддзела культуры была Рынкевіч, а кансультантам працаваў паэт Станіслаў Шушкевіч – бацька старшыні Вярхоўнага Савета Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С,С.Шушкевіча.

Вот ты пытаеш мяне. чаму я стаў пісаць песні. Я і сёння не магу адказаць на гэта пытанне дакладна. Хутчэй за ўсё, таму што спявала мая душа. Хаця час быў даволі цяжкі. Як і ў жыцці, у маёй песні дарога была прамой, таму што ніхто ніколі мне не пратэжыраваў. Я ніколі не ствараў песні на заказ ці на “рыбу”. Заўсёды я пісаў і пішу толькі на заклік сэрца. Галоўнымі тэмамі сваёй творчасці сталі Вялікая Айчынная вайна, асабліва Вялікая Перамога над германскім нацызмам, мая Беларусь і жыццё маіх супляменнікаў, беларускага народа. Тэмы і сюжэты для сваіх песень я бяру з рэчаіснасці. Адчуваю, што сёння мой творчы патэнцыял значна вышэй, чым быў у маладосці.

Мяне цёпла сустракалі беларускія кампазітары Іван Кузняцоў, Юрый Семеняка, Яўген Цікоцкі, Леанід Захлеўны, Дзмітрый Смольскі, Віктар Войцік, Уладзімір Алоўнікаў, Марк Шнэйдэрман, Эдуард Зарыцкі, Эдуард Казачкоў, Уладзімір Буднік, Валянціна Сярых, Анатоль Ізотаў. Мікалай Літвін, Алег Чыркун і іншыя

Першую прэмію я атрымаў за песню “Родны дом”, музыку для якой напісаў Юрый Семеняка. Потым прагучала на ўвесь Савецкі Саюз наша сумесная з Дзмітрыем Смольскім песня “Абеліскі”…

Песні на мае словы падабаюцца людзям. Я атрымліваю шмат лістоў з бліжняга і далёкага замежжа. 10 год назад - 29 красавіка 1990 года у тэатральнай зале Мінскага дома афіцэраў адбыўся мой адзіны аўтарскі вечар. які прайшоў з вялікім поспехам. Усё гэта дзякуючы Уладзіміру Сакалову.

З беларускіх спевакоў больш за ўсё мне падабаецца Якаў Навуменка. Дарэчы, ён добра спявае і мае песні”.

Зоркавым для Міхася Ясеня і Ігара Лучанка стаў 1966-ы год, калі яны стварылі песню “Память сердца”.

Сотні тысяч жыхароў нашай рэспублікі, у тым ліку вялікае мноства настаўнікаў і выкладчыкаў і сення з асалодай спяваюць наступныя радкі:

“Когда ночь город обнимает
И молча звёзды зажигает,
А песня сердце приласкает
И Минск уставший мирно спит, -
Не спится только ветерану,
Войны минувшей партизану:
Ночь растревожила в нём раны,
И память сердца говорит…”

Праз шмат гадоў Міхась Аронавіч нагадваў:

“Я поставил листок со стихами на пюпитр пианино Игоря Лученка, прочёл их, напел, стараясь передать необходимый, как мне казалось, ритм

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

будущей песни, попрощался и ушёл. А Игорь в темпе написал клавир песни и отнёс певцу».

9 мая 1966 песня “Память сердца” прагучала з тэлеэкранаў у выкананні Ігара Сарокіна, якому акампаніравала жонка Вера Сарокіна.

Першы Усесаюзны конкурс савецкай песні, які адбыўся ў тым жа 1966-м годзе, стаў трыумфам майстроў беларускай эстрады. Усяго на конкурс было прадстаўлена 80 твораў прафесійных аўтараў, членаў творчых саюзаў. Але перамаглі ў ім Віктар Вуяччыч, які выканаў песню “Память сердца”, і аўтары Ігар Лучанок і Міхась Ясень.

Акрамя гэтай песні, у Міхася Аронавіча ёсь дзесяткі іншых, не менш прыгожых і кранаючых сэрцы людзей.

Адразу ўспамінаеш песню “Письмо из сорок пятого»:

«Я шлю тебе письмо из сорок пятого…
Взгляни на снимок, сверстник дорогой.
На нём я вместе с нашими ребятами.
Ты посмотри, какой я молодой!

Спецкор газеты фронтовой нас высмотрел
И, щёлкнув «лейкой», адрес взял с собой.
А мы опять ушли туда, где выстрелы…
Ты посмотри, какой я молодой!»

У сваіх вершах, якія сталі песнямі, Міхась Ясень акцэнтуе ўвагу чытачоў і слухачоў, што савецкі салдат быў не толькі салдатам-пераможцам, а яшчэ вызваліцелем Еўропы. Удумаемся з вамі ў радкі верша-песні “Майский вальс» (Помнит Вена):

«Весна сорок пятого года…
Как ждал тебя долго Дунай!
Народам Европы свободу
Принёс жаркий, солнечный май.
На площади Вены спасённой
Собрался народ стар и млад –
На старой, израненной в битвах гармони
Валь русский играл наш солдат.

Припев:
Помнит Вена,
Помнят Альпы
И Дунай
Тот цветущий
И поющий
Яркий май.
Вихри венцев
В русском вальсе
Сквозь года

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Помнит сердце,
Не забудет
Никогда”

Сапраўды ўсенароднай можна назваць песню “Абеліскі”, створаную паэтам Міхасём Ясенем і кампазітарам Дзмітрыем Смольскі м. Гэта рэквіем савецкім воінам, якія загінулі за свабоду і незалежнасць нашай Айчыны у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Асабліва гэта песня актуальна і папулярна ў Беларусі, дзе загінуў кожны трэці жыхар, і якую многія замежныя турысты невыпадкова называюць краінай абеліскаў.

Нельга без хвалявання спяваць як тэкст песні, так і яе прыпеў:

“В сопках маньчжурских,
В норвежских фиордах скалистых,
В море, на суше
Советские воины спят.
В Минске и Риме,
В Софии, Варшаве, Париже
Им обелиски стоят.

Припев:
Люди! Пред ними
Вы головы низко склоните.
Люди! Молчаньем
Вы светлую память почтите
Тех, кто насмерть стоял,
Кто нам жизнь отстоял,
Кто нам мир на земле завещал”

Адной з апошніх песен, створаных Міхасём Ясенем і кампазітарам Леанідам Захлеўным, стала песня “Дзевятага Мая”. Яна хутка стала папулярнай як сярод ветэранаў вайны, так і сярод моладзі. Аўтар гэтых радкоў чуў словы гэтай песні ў парках Перамогі, Чэлюскінцаў і імя Горкага ў дні святкавання 70-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў. Яны нагадвалі ім аб ахвярах вайны, а ветэранам – яшчэ пра загінуўшых аднапалчан.

Нагадаем толькі два куплеты песні “Дзевятага Мая”:

“Вясна залатая
Дзевятага Мая
Прынесла да нас Перамогу бацькоў!
Айчыны прасторы.
І кветкі, і зоры
Сустрэлі з любоўю адважных
Байцоў!

…Пад гром кананады

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ішлі ў бой салдаты
За нашу Разіму, каб змоўк рык вайны!
І спяць сёння роты
У пушчах, балотах…
А колькі? Ніколі не зведаем мы…
Плывуць успаміны…
І попел Хатыні,
І Мінска руіны.
Суровы шум хвой…"

Міхась Ясень – аўтар кніг "Письмо из 45-го: Песни и стихи» (Мн., 2001) и «Война.Любовь. Победа»: песни» (Мн., 2005). Выданне першай кнігі прафінансаваў Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, а ў фінансаванні другой кнігі акрамя гэтага Фонда прынялі ўдзел таксама прадпрыемствы і арганізацыі Першамайскага раёна г.Мінска.

Аналізуючы змест гэтых кніг, прыходзіш да высновы, што на самой справе можна лічыць Міхася Ясеня песняром Перамогі. Акрамя вышэйназваных вершаў-песень, яго пяру належаць такія песні, як "Победа", "Поэтический венок победе», «Сорок пятый», «Ты пришла к нам Победа», «С днём рождения, Победа!», «И всё-таки тогда мы победили», «От Москвы до Берлина».

Многіх чытачоў "Настаўніцкай газеты" цікавіць адказ на пытанне:

"Як ацэньвалі творчасць паэта песенніка Міхася Ясеня беларускія і расійскія кампазітары?"

Паспрабуем адказаць на гэта пытанне.

Народны артыст СССР, лаурэат Дзяржаўнай пэміі Беларусі Ігар Лучанок:

"Я многим обязан Михаилу Ясеню, который написал текст песни «Память сердца». Такой напряжённой творческой работы с поэтом у меня ещё не было… Вообще, в таком непростом деле, как создание песни, многое зависит от текста. Талантливый, сердечный стих воспламеняет композитора, вызывает у него горячие ответные чувства, даёт толчок творческой мысли».

На кнізе "Кампазітары Беларусі" (Мдзівані Т.Г. і Сергіенка Р.І. – Мн., 1997) І. Лучанок аставіў М.Ясеню такі аўтограф:

"Мише – Игорь Лученок. Ты, Миша, яркая звезда на песенном олимпе. Гори вечно. Твой Лученок".

Народны артыст Беларуси , лауреат Государственной премии Беларуси, профессор Дмитрий Смольский:

"Поэт-песенник – это особый талант. Он должен чувствовать музыкальный образ, музыкальный ритм стиха, особенности песенного жанра. Я думаю, что многие лучшие песни белорусских композиторов созданы именно на стихи М.Ясеня. И заслуга этого человека не только в том. что он наст ойчиво предлагает своим соавторам интересный материал, но и в том,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

что материал этот а буквальном смысле ложится на музыку, обладает колоссальной музыкальной образностью”:

Народны артыст Беларусі, лаурэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Леанід Захлеўны:

“Особо хочется отметить чрезвычайную музыкальность М.Ясеня, поэтому песни на его стихи у меня пишутся легкоиі как бы на одном дыхании, а порой в основу запева или припева песни ложились мелодические варианты, предложенные самим поэтом.

Хочу сказать, что с точки зрения творчества, мы с Михаилом Ясенем родственные души, мне с ним легко и просто в общении, наверно, потому, что нашими идеалами в творчестве стали: любовь к Родине, огромное уважение к людям, которые подарили нам мир и Победу, любовь к белорусской земле”

Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Віктар Войцік:

“…Разам мы стварылі каля 20 песень. Працуецца мне з Міхаілам Аронавічам вельмі лёгка. Яго вершы самі падказваюць патрэбную інтанацыю. У іх адчуваецца прыхаваная музыка, якая пачынае хваляваць ужо пасля першага прачытання. Хочацца знайсці тую адзіную, адпаведную тэксту мелодыю, разгадаць яе таямніцу. Калі гэта не адбылося адразу, то ўсё роўна жывеш у прадчуванні, што яна хутка з’явіцца. І гэта напаўняе душу радасцю творчасці”.

Высокую ацэнку творчасці М.Ясеня даў народны артыст Расіі, заслужаны дзеяч маст ацтваў Беларусі Васіль Сербін. Ён падкрэсліў:

“По количеству, качеству и художественному воплощению военно-патриотической темы литературно-песенное творчество участника Великой Отечественной войны М.Ясеня не имеет себе равных в Беларуси”.

Чытачам “Настаўніцкай газеты”, напэўна, цікава ведаць аб прычыне з’яўлення такога псеўданіма - “М.Ясень”.

Гэта адбылося зусім выпадкова. Яго прыдумала вядомая беларуская пісьменніца, заслужаны работнік культуры Беларусі, дарэчы выпускніца Рагачоўскага настаўніцкага інстытута і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Алена Васілевіч. Яна параіла Міхасю Аронавічу прыдумаць добры псеўданім. Яны доўга думалі, які. Паэт-песеннік сказаў, што ён вельмі любіць лес, прыроду. Алена Васілевіч практычна адразу адказала: “Ясень”. Затым яна растлумачыла;

“Таму, што вы вельмі ясны чалавек”.

Менш чым за чатыры гады да сваёй смерці – 28 кастрычніка 2002 года Міхась Аронавіч расшыфраваў свіой псеўданім такім чынам: “Я-С-Е-Н: Я СЫН ЕВРЕЙСКОГО НАРОДА”.

Міхась Ясень стварыў дружную сям’ю. Яго жонка Эла Навумаўна доўгі час працавала настаўні цай англійскай мо ў адной з мінскіх школ. Адзіны сын – Леанід Міхайлавіч стаў вядомым юрыстам і працуе ў Маскве.

У Ясеня шмат песен аб каханні. Але сваёй жонцы ён прысвяціў толькі адну. У ёй есць такія радкі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Ну, что ты отвернулась?
Ты лучше б улыбнулась,
сверкни с воей улыбкой,
со мною пошути.
Забудем эту ссору,
Забудем наши споры,
они любви не стоят,
скорей меня прости”.

У размове з аўтарам гэтых радкоў Міхась Аронавіч прызнаўся:

“Эла – мая першая і адзіная жонка. У мяне проста не магло быць інакш Яна і сын Леанід увесь час стваралі вакол мяне утульную атмасферу любові і дружбы, узаемаразумення”

Якім жа быў Міхась Ясень як чалавек?

У 1997 годзе ў інтэрв’ю журналісту часопіса “Роднае слова” С.Харэвічу ён адзначаў:

“У людзях цаню павагу да кожнага, прыстойнасць у адносінах. Лічу, што талент – не самае істотнае ў чалавеку. Галоўнае – каб у адносінах паміж людзьмі не было ніякай хлусні, крывадушша, плётак. Самае важнае – праца!

…Губляюся я там, дзе мас а людзей, натоўп. Таму не люблю ўсялякіх мітынгаў, шэсцяў, дэманстрацый, пасяджэнняў, палітычных гульняў. Я ніколі не быў членам якой-небудзь партыі. У мяне свой погляд на з’явы, якія адбываюцца ў грамадстве. Я ўбаку ад балбатні. Лічу, што творчасць – гэта асабістая справа творцы….

Грошы ніколі для мяне не былі галоўнай мэтай, не засляплялі мне вочы. Я ніколі асабліва не цікавіўся імі, быў непераборлівы ў жыцці да ежы і вопраткі…

Па характары я аптыміст…”

Менш чым за год да сваёй смерці -14 ліпеня 2005 года ў сваім аўтографе на кнізе “Письмо из 45-го”, якую ён падараваў мне, Міхась Ясень напісаў:

“…Всегда помни, дорогой: останутся – честность, благородство, доброжелательность! Здоровья, удачи, Счастья!».

Сярод баявых узнагарод Міхася Аронавіча былі ордэн Айчыннай вайны 2-й ступені, медалі “За адвагу”, “За абарону Ленінграда” , “За перамогу над Германіяй у Вялікай айчыннай вайне і іншыя медалі.

У той час, як кампазітары, якія пісалі музыку на вершы паэта, атрымоўвалі ганаровыя званні і высокія ўзнагароды (асабліва гэта датычыцца Ігара Лучанка), ён сам шмат дзесяцігоддзяў аставаўся без усякай узнагароды.

Нарэшце, за тры года да свай смерці - у 2003 годзе М.Ясень быў узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь “За заслугі ў развіцці нацыянальнай культуры і значны ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сэрца паэта спынілася 10 мая 2006 года - на другі дзень пасля святкавання 61-й гадавіны Вялікай Перамогі, песняром якой Міхась Ясень быў усё сваё жыццё. Ён пахаваны на Усходніх могілках.

Праз шэсць дзён - 16 мая 2006 года цэнтральная газета нашай краіны "СБ. Беларусь сегодня" змясціла кароткі некралог. У ім былі такія радкі:

"В Минске от сердечного приступа скончался известный поэт Михаил Ясень (Гольдман), автор легендарных песен «Письмо из 45-го, «Майский вальс».

Гражданская панихида состоялась в Союзе композиторов в пятницу. На панихиде был выстроен почётный военный караул. Оркестр играл фронтовые вальсы…Усилиями Министерства обороны удалось добиться захоронения Михаила Ароновича на Московском кладбище, закрытом для захоронений уже несколько лет, но для Ясеня сделали исключение.

В последние годы Михаил Аронович вёл уединённый образ жизни. На публике появлялся мало. От интервью чаще отказывался. Два года назад нам удалось уговорить его опубликовать в "СБ" "Письмо из 45-го", в котором Михаил Ясень искренне и с большим чувством рассказал историю создания своей, как он считал, лучшей песни".

Роўна праз год Міхасю Ясеню паставілі помні к. Скульптурную кампазіцыю ўпрыгожвае галіна ясеня. Мемарыял стварылі скульптар Уладзімір Слабодчыкаў і архітэктар Ігар Марозаў.

Хочацца спадзявацца, што памяць аб паэце-песенніке, песняру Вялікай Перамогі назаўсёды застанецца ў сэрцах беларускага настаўніцтва, усяго беларускага народа.

Уклад Міхася Ясеня ў развіццё беларускай культуру дастойны таго, каб яго імя насіла адна з новых вуліц горада Мінска.

Эмануіл Рыгоравіч Іофе, прафесар БДПУ імя М.Танка,
доктар гістарычных навук
220005, г.Мінск, пр.Незалежнасці,39-90. Т.2-84-83-79.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ